## ПРАДМОВА

Другая частка «Хрэстаматыі па гісторыі беларускай мовы» змяшчае матэрыялы, якія адлюстроўваюць працэс фарміравання мовы беларускай нацыі і храналагічна ахопліваюць перыяд ад пачатку XIX да 20-х гадоў XX ст.

Складальнікі імкнуліся адлюстраваць жывую беларускую мову адзначанага перыяду, а таксама паказаць развіццё беларускай літаратурнай мовы гэтага часу ў яе важнейшых жанрава-стылявых разнавіднасцях.

У першым раздзеле «Хрэстаматыі» («Беларускія народныя гаворкі XIX — пачатку XX ст.») змешчаны ўзоры фальклорна-этнаграфічных запісаў, якія найбольш поўна адлюстроўваюць жывую мову розных мясцовасцей Беларусі (апавяданні, легенды, паданні, успаміны, дыялагі, песні і казкі — урыўкамі або поўнасцю). Матэрыял гэтага раздзела размеркаван з улікам сучаснага адміністрацыйнага падзелу.

У другі раздзел («Беларуская літаратурная мова XIX — пачатку XX ст.») уключаны важнейшыя ў моўных адносінах творы беларускай літаратуры гэтага перыяду. Тэксты размешчаны ў храналагічным парадку і падаюцца, як правіла, па першавыданнях. Творы, якія выдаваліся некалькі разоў, суправаджаюцца важнейшымі граматычнымі і лексічнымі варыянтамі пазнейшых выданняў.

Тэксты «Хрэстаматыі» друкуюцца з захаваннем графічна-арфаграфічных і граматычных асаблівасцей першавыданняў. Толькі відавочныя друкарскія памылкі выпраўлены, але яны агавораны ў заўвагах. У заўвагах растлумачаны таксама паасобныя вузкадыялектныя і некаторыя іншыя граматычныя рысы тэкстаў.

У канцы «Хрэстаматыі» змешчаны заўвагі аб графічных і арфаграфічных асаблівасцях тэкстаў, запісаных кірыліцай і лацінкай, а таксама слоўнік незразумелых слоў. У слоўніку

адзначаюцца толькі тыя значэнні, якія сустракаюцца ў тэкстах «Хрэстаматыі».

Тэксты першага раздзела «Хрэстаматыі», слоўнік і граматычныя каментарыі падрыхтавалі У. В. Анічэнка і А. І. Жураўскі. Тэксты другога раздзела размяркоўваюцца паміж укладальнікамі наступным чынам:

Анічэнка У. В.: 6-б; 10; 11-б, в; 13-г; 16; 17; 18-д; 20-а—ж; і—л; 22;

Вярхоў П. В.: 1; 3; 4-д; 5; 6-в; 7; 8-б—з; 9-а, б, г, д; 12; 13-в; 14; 18-г; 21-а, в—ж;

Жураўскі А. І.: 2; 4-а—г; 6-а; 8-а; 11-а; 13-б; 15;

Рамановіч Я. М.: 8-і, к; 9-в; 13-а; 18-а, б, в, е; 19; 20-з; 21-б.